Міхаіл Баярын

# УЗОРЫ СВАДЗЕІ

## 5. Мова

# МОВА

*Мова* - гэта дзея злучэньня імя і аб'ёму.

# ІМЯ

Свадзея *імені* падаўляецца свадзеяй *аб'ёму*. Як сьлед, імя выступае замест аб'ёму.

# ДРЭВА ІМЁН

Імя існуе на *дрэве імён*. Дрэва імён - гэта прастора свадзеі, што ад першай мярэжы бясконца галініць сем падзей. Імя можна знайсьці на дрэве, паўтарыўшы яго падзеі. Імя - гэта месца-знаходжаньне аб’ёму.



# БУДОВА ІМЕНІ

Імя мае пасьлядоўную будову. Імя можа быць сувойным і мярэжным. Сувойнае імя - гэта сувой, часткі якога падзяляюцца падзеяй чыну. Мярэжнае імя - гэта пасьлядоўнасьць падзей адной мярэжы.

# АБ’ЁМ

*Аб'ём* свадзеі ўтвараецца як узор на просторы мовы. Імя - гэта месца пачатку гэтага ўзору на дрэве мовы, дзе свадзея ўзыходзіць на ўзровень над-ад'явы.

# БУДОВА АБ’ЁМУ

Аб’ём мае разгалінаваную будову і неабмежаваны памер. Аб’ёмы зьяўляюцца як плады на дрэве імён. Дзея мовы скарачае аб’ём да імені, яко месца на дрэве мовы.

# СЕТКА ІМЁН

Аб'ём можа зьмяшчаць ад'явы іншых імён. Так утвараецца *сетка імён*.



# ЗГОРТ

*Згорт* - гэтаператвор, што зьвязвае імя і аб'ём. Апошняя падзея імені над-ад'яўна таясаміцца зь першай падзеяй аб'ёму. Аб'ём зьяўляецца асобай згорту, а імя - дачынам. Згорт зьвязвае імя і аб'ём чынам раўнаньня.

# АПОВЕД МОВЫ

Кожны згорт ёсьць кароткай удзеяй мовы і можа мецць пасьлядзеі. Усе рады згортаў складаюць *аповед мовы*.

# РОСТ МОВЫ

Дзея мовы *расьце* імёнамі і аб'ёмамі. Імя можа мець некалькі аб'ёмаў, і аб'ём можа мець некалькі імён. Аб'ём, што зьмяшчае ад'явы імён, зьмяняецца разам са зьменай іх згортаў. Цягам аповеду мовы зьмест сеткі імён і адносіны імён і аб'ёмаў могуць цалком зьмяніцца.

# МОВА МОЎ

Мова, галінамі дрэва якой зьяўляюцца іншыя дрэвы імён, называецца *мовай моў*. Усе мовы ствараюцца ў яе абсягу.



# НАДМОВА І ПАДМОВА

Мова, што галініцца іншымі мовамі, завецца *надмовай*. Мова, што зьмяшчаецца на дрэве іншай мовы, завецца яе *падмовай*. Імя любой мовы даступна для мовы моў, калі зьмяшчае імёны ўсіх сваіх надмоў. Над-мова можа над-ад’яўна надбудоўвацца над любой часткай дрэва мовы. Таму дрэва мовы моў расьце ўва ўсе бакі адразу.

# МОВА ЯК ІМЯ

Усякае імя можа раскрыцца новай падмовай. Падмова заўжды зьяўляецца іменем для сваёй надмовы. Мова, што мае віды імён, зьяўляецца надмовай, кожнае імя якой разгаліноўваецца мовай імён пэўнага віду.

# ДЗЕЯ ЯК МОВА

Усякая дзея можа быць прачытана над-дзеяй як мова, бо прастора свадзеі заўсёды можа быць ужыта як дрэва імён, па якім можа быць знойдзена месцазнаходжаньне любога ўзора свадзеі.

# СКАЗ

Мярэжа, падзеі якой запоўнены ад'явамі імёнаў, завецца *сказам*.

# ПЕРАКЛАДНІЦА

Мова, аб'ёмамі якой зьяўляюцца імёны адной мовы, а імёнамі - імёны другой мовы, завецца *перакладніцай*.

# СУВОЙНІЦА

Перакладніца, якая чытае ператварае мярэжнае імя ў сувойнае, завецца *сувойніцай*. Такім чынам сказы адной мовы могуць рабіцца імёнамі іншай мовы.

# МЯРЭЖНІЦА

Перакладніца, якая ператварае сувойнае імя ў мярэжнае, завецца *мярэжніцай*. Такім чынам імя адной мовы можа стаць сказам іншай мовы.

# РАЗМОВА

Размова складаецца з казаньня і чытаньня. Казаньне і чытаньне зьяўляюцца пасьлядоўнасьцю перакладу, што можа зьвязваць некалькі моў. Размова дзей супадабняе іх сеткі свадзеі.

# МОВА НАЗОВАЎ

Зыходнай мовай казаньня і апошняй мовай чытаньня зьяўляецца *мова назоваў*. Яе імёны зьяўляюцца назовамі дачынаў маўленьня.

# МЯРЭЖА СКАЗУ

Падзеі мярэжы сказу абсягаюць імёны мовы назоваў.

# ПРЫСТАСОВА

Выказваньне ўлучае імёны ў мярэжу сказу. *Прыстасова* - гэта мова, што правярае сказ на адпаведнасьць абавязковым правілам размовы.

# ПРЫСТАСОВА МЯРЭЖЫ СКАЗУ

Пераклад мярэжы сказу ў мярэжу парадку пачынаецца зь яе прыстасовы да правілаў перакладу. Правілы прыстасовы правяраюць мярэжу сказу на адпаведнасьць імёнам мовы перакладу.

# МОВА БУДОВЫ

Мовы будовы - гэта сувойніца, што ўтварае новыя імёны са злучэньня імёнаў. Аб'ёмам мовы будовы зьяўляецца новае імя, што замяняе адпаведную частку сказу і можа дадавацца ў мову назоваў.

# МЯРЭЖА РАЗМОВЫ

Мярэжа сказу стаецца дачынам над-ад'яўнай мярэжы размовы, што выражае намер выказу: паведамленьне, пытаньне, загад. Мярэжа размовы абсягае адзінкі мярэжы сказу. Мярэжа размовы зьмяшчае вядомы вузел сеткі свадзеі і невядомую частку, што мае быць да яго дададзенай. Мярэжа размовы складаецца з чыну размовы (паведамленьня, пытаньня, загаду), месца размовы - вядомай часткі сеткі, дачыну размовы, невядомай часткі паведамленьня, вычыну размовы (атрымальніка паведамленьня), прычыны размовы (адпраўніка паведамленьня). Мярэжа размовы можа зьмяшчаць пад-мярэжы размовы.



# ПРЫСТАСОВА МЯРЭЖЫ РАЗМОВЫ

Прыстасова мярэжы размовы правярае яе на адпаведнасьць абавязковым імёнам мовы перакладу: выяўленасьці віду выказу, крыніцы і атрымальніка паведамленьня, вядомай і невядомай часткі.

# ДЗЕЯ РАЗМОВЫ

Моўныя зносіны дзей уяўляюць сабой задпаведненьне свадзеных сетак удзельнікаў размовы. Мярэжа размовы складае зьвяно дзеі размовы, дзе дачын папярэдняй мярэжы стаецца месцам наступнай, ажно да спыненьня задпаведненьня. Некаторыя крокі дзеі размовы адбываюцца па-за выказам, калі ахопліваюць вядомую частку сеткі.



# МЯРЭЖА ПАРАДКУ

Мярэжа парадку перакладаецца ў мову руху. Мярэжа парадку ўтварае парадак выказу для празоры, адпаведнай праяве мовы рэчыва. Від мярэжы парадку вызначае пасьлядоўнасьць, інтанацыю і іншыя сродкі выяўленьня, што зьяўляюцца на ўзроўні цэлага выказу.



# МОВА РУХАЎ

Апошняй мовай казаньня зьяўляецца *мова рухаў*. Гэта сувойніца, што перакладае мярэжу парадку ў пасьлядоўнасьць рухаў у празоры выражэньня. Атрымальнікам выказу мовы рухаў зьяўляецца над-дзея.

# МОВА СКАЗУ

Мова сказу - гэта мова, якая чытае пасьлядоўнае выказваньне мовы рэчыва і ўтварае сказ. Імёны, улучаныя ў мярэжу сказу, чытаюцца мова назоваў і вядуць да аб'ёмаў свадзеі.

# ПЕРАКЛАД У МОВУ РЭЧЫВА

Мовай рэчыва валодае над-дзея. Асабовая дзея размаўляе з над-дзеяй мовай руху, утвараючы свадзею ў празорах выражэньня і атрымлівае адказ мовай рэчыва ў празорах успрыманьня.

# ПЕРАКЛАД З МОВЫ РЭЧЫВА

Выказ мовы рэчыва чытаецца дрэвам імён мовы размовы, падзяляецца на часткі і запаўняе мярэжу парадку. Зь мярэжы парадку чытаецца мярэжа размовы, а затым мярэжа назоваў. Знаходзіцца вядомы вузел сеткі свадзеі, да якога мацуюцца новыя ніці ткані.

# ПРАТВОР’Е

Пратвор'е - гэта збор пратвораў. Пратворы зьяўляюцца імёнамі мовы рухаў, на якія падзяляюцца назовы пры перакладзе. Таму пратворы супадаюць з найменшымі крокамі па дрэве імён, што ўтвараюць адрозьненьне між імёнамі.

# АБСЯГ І РАСЬСЯГ

Дзея перакладу складаецца з абсяганьня, радкаваньня і расьсяганьня імёнаў. Абсяганьне азначае запаўненьне імёнамі мярэжы сказу. Радкаваньне ператварае сказ у пасьлядоўнасьць імені. Расьсяганьне азначае запаўненьне мярэжы сказу часткамі падзеленага імені. Мярэжа сказу абсягае імёны мовы назоваў. Моа будовы радкуе часткі сказу ў новыя імёны. Мярэжа размовы абсягае часткі сказу. Мярэжа парадку абсягае часткі мярэжы размовы. Мова рухаў радкуе мярэжу парадку. Мова сказу расьсягае імёны мовы рэчыва.


МОВА НАЗОВАЎ
Абсяганьне
МЯРЭЖА СКАЗУ
Радкаваньне
ПРЫСТАСОВА
Радкаваньне
МОВА БУДОВЫ
Абсяганьне
МЯРЭЖА ПАРАДКУ
Радкаваньне
МОВА РУХАЎ
Радкаваньне
МОВА РЭЧЫВА
Расьсяганьне
МОВА СКАЗУ

# ВЕДА МОВЫ

Вывучэньнем размовы мае на ўвеце веданьне наступных моў:

1. пратвор'е
2. прыстасова
3. будаўніца
4. парадкоўніца

# НАЗОЎНЫ ЗГОРТ

Згорт назоўніцы завецца назоўным згортам.



# ПРЫСТАСОЎНЫ ЗГОРТ

Згорт прыстасовы завецца прыстасоўным згортам. Прыстасоўны згорт правярае імя на адпаведнасьць абавязковым правілам мовы размовы, наяўнасьць свадзеі роду, ліку, часьціны мовы і г.д.

# БУДАЎНІЧЫ ЗГОРТ

Згорт мовы будовы завецца будаўнічым згортам. Будаўнічы згорт стварае новае імя зь мярэжы злучэньня імён і дадае яго ў мову назоваў ці мярэжу сказу. Прыгэтым будаўнічы згорт дадае да імені частку, мяняе імя на іншае імя або падвойвае імя.

# ПАДПАРАДКАВАНЬНЕ

Падпарадкаваньне - выкананьне выказу адной мовы сродкамі іншай мовы. Прыкладам падпарадкаваньня можа быць малюнак твару, зроблены чысламі.

# МОВА-ВОБРАЗ І МОВА-РЭЧЫВА

Падпарадкаваная мова завецца мовай-рэчывам. Мова-падпарадкоўніца завецца мовай-вобразам. Падпарадкаваньне зьдзяйсьняецца мовай над-дзеі.

# СЛОВА

Узнаўленьне імені падпарадкоўніцы сродкамі падпарадкаванай мовы стварае слова. Слова - гэта разгортваньне імені ў іншай мове.

# РЭЧ

Узнаўленьне аб'ёму імені падпарадкоўніцы сродкамі падпарадкаванай мовы стварае рэч. Рэч - гэта разгортваньне аб'ёму імені ў іншай мове.

# ВЫКАЗ

Выказ, напрамлены адной дзеяй да іншай дзеі, мае наўвеце падпарадкаваньне мовы рэчыва, якой валодае над-дзея. Выказ утварае словы і рэчы.

# СКАЖЭНЬНЕ

Мова-рэчыва мае свае імёны і аб'ёмы і будуе выказы паводле сваіх правілаў. Таму пры падпарадкаваньні адбываюцца скажэньні выказаў мовы-падпарадкоўніцы. Становішчавыя зьмены пратвораў зьяўляюцца часткай ня мовы-вобразу, а мовы-рэчыва.

# ПЕРАСТАНОВА

Перастанова - гэта ад'яўленьне выказу мовы ў іншай празоры. Прыкладам перастановы зьяўляецца зрокавы запіс гукавага выказваньня. Перастанову зьдзяйсьняе мова-перакладніца, імёнамі і аб'ёмамі якой зьяўляюцца пратворы ў розных празорах.

# АДМЕННАСЬЦЬ

Адменнасьць - гэта наяўнасьць адразу некалькіх згортаў для аднаго імя.

# СВАДЗЕЙНЫЯ МОВЫ

Свадзейная мова мае быць ад'явай прамовы. Аб'ёмы яе імён складаюць падзеі, сувой, развой, пад-падзеі, празоры і ператорнікі. мёны свадзейных моў утвараюць узоры свадзеі.

